**ГАРАДСКА́Я У́ПРА́ВА**, выканаўчы орган гар. думы ў Рас. імперыі. Складалася з 2—3 асоб, выбраных думай. Узначальваў управу *гарадскі галава* (адначасова быў і старшынёй гар. думы). Члены ўправы лічыліся на дзярж. службе і атрымлівалі заработную плату, якую ўстанаўлівала гар. дума з фонду гар. даходаў. Г.ў. мела пастаянную канцылярыю, якая падзялялася на шэраг аддзелаў, адпаведных функцыям гар. самакіравання. Пры ёй ствараліся пастаянныя і часовыя камісіі. Гар. ўправы займаліся пытаннямі гаспадаркі і добраўпарадкавання гарадоў, супрацьпажарнымі мерапрыемствамі, ажыццяўлялі нагляд за развіццём мясц. гандлю і прам-сці, кіравалі гар. медыцынай і нар. адукацыяй. Не валодалі прымусовай уладай, падпарадкоўваліся губернатару і міністру ўнутр. спраў, якія маглі накласці вета на любое рашэнне ці пастанову Г.ў. У Беларусі, дзе гар. даходы былі меншыя за расходы, Г.ў. выбіраліся пераважна ў губ. гарадах. У большасці пав. гарадоў функцыі Г.ў. выконваў гар. галава. *А.М.Люты.*

**ГАРАДСКІ́ ВЫЯЎЛЕ́НЧЫ ФАЛЬКЛО́Р**, від народнай творчасці, які развіваецца ў рэчышчы мастацтва *прымітывізму.* Генетычна звязаны з сял. творчасцю, сістэмай нар. выяўленчага і дэкар.-прыкладнога мастацтва. Выразна выявіўся ў 2-й пал. 18 ст., калі завяршылася дыферэнцыяцыя на прафес. і нар. мастацтва, на сял. і гар. культуру. Як самаст. галіна развіваўся ў 19 — пач. 20 ст. (рускі мяшчанскі, купецкі партрэт). Яго стваральнікі — гар. і прыгонныя дваровыя мастакі, рамеснікі, дробныя гандляры, купцы і інш., найчасцей — самавукі, дылетанты, аматары, былі і прафес. рамеснікі, выхаванцы правінцыяльных маст. школ. Існавалі розныя спосабы і формы выяўлення: станковыя, камерныя (лубок, безыменныя мяшчанскія партрэты), манум.-дэкар. (размалёўка інтэр'ераў шынкоў і корчмаў, шыльды і вітрыны крам, жывапіс на плоце і інш.), тэатр.-дэкарацыйныя (антураж правінцыяльных фотастудый, афішы, дэкарацыі ў балаганах, цырках, батлейках і інш.). Адметныя рысы: рэпрэзентатыўнасць, дэмакратызм, стыхійны рэалізм і непасрэднасць выяўл. мовы, свежасць светаўспрымання, плоскаснасць формаў, перавага стракатых фарбаў, святочныя інтанацыі, гумар і інш. У Г.в.ф. ёідавочны і адбітак маст. кірункаў (*класіцызм, рамантызм, рэалізм, мадэрн* і інш.). Многія віды традыц. нар. мастацтва істотна паўплывалі і ўзбагацілі яго. На пачатку творчасці многія мастакі 19—20 ст. зазналі ўплыў Г.в.ф., сярод іх М.*Шагал*, М.Ларыёнаў, Н.*Ганчарова*, А.*Шаўчэнка*, У.Лебедзеў, І.*Машкоў* і інш. чл. аб'яднання *«Бубновы валет»*, а таксама інш. жывапісцы, графікі.

*Літ.:* Островский Г.С. О городском изобразительном фольклоре // Сов. искусствознание, 74. М., 1975. *М.Л.Цыбульскі.*

**ГАРАДСКІ́ ГАЛАВА́**, службовая асоба ў Рас. імперыі. Узначальваў *гарадскую думу* і *гарадскую ўправу.* Пасада ўведзена ў 1785. Паводле *гарадской рэформы 1870—75* Г.г. выбіраўся на 4 гады гар. думай і зацвярджаўся міністрам унутр. спраў (у губ. гарадах) або губернатарам. У невял. гарадах выконваў функцыі гар. управы. Сумяшчэнне ў асобе Г.г. пасад старшыні гар. управы і старшыні гар. думы абмяжоўвала дзейнасць апошняй і пакідала магчымасць самавольства. З 1892 Г.г. лічыўся чыноўнікам дзярж. службы. Паводле закону ад 16.6.1870 на пасады Г.г. і яго намеснікаў забаранялася выбіраць яўрэяў, што асабліва датычыла бел. губерняў. *А.М.Люты.*

**ГАРАДСКІ́ ПАСЁЛАК**, катэгорыя населенага пункта гар. тыпу, у якім не менш за 2 тыс. ж. і большасць з іх рабочыя, служачыя і члены іх сем'яў. На Беларусі ўведзены Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 27.9.1938 «Аб класіфікацыі населеных пунктаў Беларускай ССР». Пры аднясенні пэўнага нас. пункта да Г.п. ўлічваецца таксама яго адм. значэнне, наяўнасць прамысл. і камунальна-быт. прадпрыемстваў, сац.-культ. устаноў. Большасць Г.п. Беларусі ўтворана з б. мястэчак, некаторыя — з вял. сёл і вёсак. На 1.1.1996 на Беларусі 95 Г.п.

**ГАРАДСКІ́ СУД**, гл. ў арт. *Суд.*

**ГАРАДСКІ́ ТРА́НСПАРТ**, сукупнасць розных відаў *транспарту*, прызначаных для перавозкі пасажыраў і грузаў у горадзе і прыгараднай зоне, выканання работ па добраўпарадкаванні. Г.т. — галіна *гарадской гаспадаркі*, уключае: трансп. сродкі (рухомы састаў), пуцявыя ўстройствы (рэльсавыя пуці, *тунэлі, эстакады, масты, пуцеправоды*, станцыі, стаянкі); прыстані і лодачныя станцыі, сродкі энергазабеспячэння (цягавыя электрападстанцыі, кабельныя і кантактныя сеткі, *аўтазаправачныя станцыі*); рамонтныя майстэрні і з-ды; *дэпо, гаражы*, станцыі тэхн. абслугоўвання; лінейныя прыстасаванні (сувязь, сігналізацыя, блакіроўка); дыспетчарскае кіраванне. Г.т. падзяляецца на пасажырскі, грузавы і спецыяльны.

Пасажырскі Г.т. аб'ядноўвае вулічны (*аўтобус, тралейбус, трамвай*), пазавулічны скорасны (*метрапалітэн, манарэйкавыя дарогі, фунікулёры*, скорасны трамвай), легкавы *аўтамабільны транспарт*, двухколавы (*матацыклы, веласіпеды, мапеды*), водны (рачныя судны, паромныя пераправы, лодкі), паветраны (верталёты) транспарт. Да грузавога Г.т. адносяцца: грузавы аўтатранспарт (гл. *Грузавы аўтамабіль*), грузавыя трамвай, тралейбус, рачныя судны, чыг. транспарт прамысл. прадпрыемстваў. Спецыяльны Г.т. уключае: палівачна-мыечныя, падмятальныя, смеццеўборачныя і *снегаўборачныя машыны*, дарожныя рэмантёры, аўтавышкі, *пажарныя машыны, рэфрыжэратары, санітарныя аўтамабілі* і інш.

Да пач. 20 ст. ў гарадах Беларусі быў толькі конны транспарт. Конка ўяўляла сабой вагон на 20—30 чал., які цягнулі 2—3 кані (на пад'ёмах запрагалі яшчэ пару коней). Скорасць 5 км/гадз. Першая конка пушчана ў Мінску ў 1892, мела 4 аднакалейныя лініі даўж. больш за 7 км. У гады грамадз. вайны не працавала, аднавіла работу ў 1921, заменена трамваем у 1929. У Магілёве конка працавала да 1910. Аўтобусны рух адкрыты ў Мінску ў 1924 (па 2 маршрутах), з 1934 стала працаваць таксі, з 1952 — тралейбус, з 1984 — метро. Першы на Беларусі трамвай пачаў працаваць у Віцебску 18.6.1898 (адзін з першых у Рас. імперыі), Наваполацку — з 1974, у Мазыры — з 1988. Тралейбусны рух пачаўся: у Мінску з верасня 1952, у Гомелі з 1962, у Магілёве з 1970, у Гродне з 1974, у Віцебску і Бабруйску з 1978, у Брэсце з 1981. *І.І.Леановіч.*

**ГАРАДСКІ́Я ВУЧЫ́ЛІШЧЫ**, пачатковыя навуч. ўстановы павышанага тыпу для дзяцей дробнай гар. буржуазіі і служачых у Расійскай імперыі, у т.л. на Беларусі, у 1872—1912. Утвораны з пав. вучылішчаў. Прымалі дзяцей з 7 гадоў. Навучанне 6-гадовае, платнае. Былі 1-, 2-, 3- і 4-класныя. У 2-класных курс 1-га класа 4-гадовы, курс 2-га класа 2-гадовы; у 3- і 4-класных курсы 1-га і 2-га класаў па 2 гады, а 3-га і 4-га па 1 году. Выпускнікі маглі паступаць у ніжэйшыя прафес. школы ці на 1- і 2-гадовыя пед. курсы пры некаторых Г.в. (давалі права выкладаць у пач. вучылішчах і паступаць у настаўніцкія ін-ты). На Беларусі ў 1906 было 60 Г.в., у т.л. 2-класных 3, 3-класных 40, 4-класных 17. У 1912 Г.в. 3- і 4-класныя пераўтвораны ў *вышэйшыя пачатковыя вучылішчы.*

**ГАРАДСКІ́Я ПАДПО́ЛЬНЫЯ КАМІТЭ́ТЫ КП(б)Б** у Вялікую Айчынную вайну, органы парт. кіраўніцтва барацьбой супраць ням.-фаш. захопнікаў у акупіраваных гарадах Беларусі ў 1941—44. Стваралі і ўзначальвалі патрыят. падполле і партыз. рух, вялі арганізатарскую і паліт. работу сярод насельніцтва. Іх дзейнасцю кіравалі ЦК КП(б)Б, *абласныя падпольныя камітэты КП(б)Б* і *міжраённыя падпольныя камітэты КП(б)Б.* Дзейнічалі Гомельскі, Мінскі (з 1941), Баранавіцкі, Віцебскі, Калінкавіцкі, Пінскі (з 1943), Брэсцкі, Вілейскі (з 1944) гаркомы, Барысаўскі (у 1941—42 спачатку як райком), Лідскі (з 1943) гаркомы-райкомы. Вопыт 1941—42 паказаў, што базіраванне гаркомаў у гарадах звязана з вял. цяжкасцямі і ахвярамі: былі арыштаваны і пакараны смерцю амаль усе члены Мінскага гаркома, загінулі кіраўнікі Барысаўскага гаркома-райкома, Брэсцкага і Аршанскага парт. цэнтра. Таму створаныя ў 1943—44 гаркомы базіраваліся пры партыз. брыгадах і атрадах. Па сваёй структуры яны не адрозніваліся ад раённых падп. к-таў КП(б)Б. Баранавіцкі і Мінскі гаркомы, Барысаўскі і Лідскі гаркомы-райкомы мелі друк. выданні — газеты.